Наталля СТАРЖЫНСКАЯ,
доктар педагагічных навук,
прафесар,
прафесар кафедры методык дашкольнай адукацыі,

Дзіна ДУБІНІНА,
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт,
загадчык кафедры методык дашкольнай адукацыі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

АЗНАЯМЛЕННЕ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ СА СПОСАБАМІ СЛОВАЎТВАРЭННЯ

Авалоданне граматычным ладам мовы, як і маўлення ў цэлым, ажыццяўляецца на аснове пазнавальнага развіцця дзіцяці. Фарміраванне граматычных навыкаў з'яўляецца «спантанейным» (А.У. Запарожац) працэсам, гэта значыць, што дзіця «здабывае» мову, яе граматычную сістэму з фактаў маўлення, якое ім успрымаецца падчас камунікацыі з дарослым і равеснікамі. Дзіця, праяўляючы творчасць, абыгрывае слова або форму, якая спадабалася, актыўна, шматразова выкарыстоўвае іх у ініцыятыўным маўленні. Педагагічнае ўздзеянне на працэс самаразвіцця заключаецца, перш за ўсё, у стварэнні ўмоў для пошукавай актыўнасці дзіцяці ў сферы граматыкі, эксперыментавання са словам і яго формамі. З гэтай мэтай важна выкарыстоўваць дыдактычныя гульні і практыкаванні з граматычным зместам.

«САЧЫНЯЕМ РЫФМОЎКІ»

Мэта: выпрацоўка арыенціроўкі на гучанне граматычных форм, пры дапамозе якіх утвараюцца назвы людзей.

Ход мерапрыемства

Выхавальнік (В.). Дзеці, ці ведаеце вы, хто такі бягун? *(Чалавек, які бяжыць. Спартсмен, які займаецца бегам.)* А хто такі крыкун? *(Адказы дзяцей.)* А як вы думаеце, хто такі лежань? А седзень? *(Адказы дзяцей.)* Вось як тлумачыць гэтыя словы беларускі паэт Васіль Вітка:

Лежань лежма ляжыць,
Седзень седзьма сядзіць,
Бягун бегма бяжыць,
Крыкун крычма крычыць.
Гультай гульма гуляе,
Абібок бок абівае...
Давайце паўторым, хто што робіць.

Дзеці дагаворваюць радкі за выхавальнікам дашкольнай адукацыі:

Лежань лежма... *(ляжыць),*
Седзень седзьма... *(сядзіць),*
Бягун бегма... *(бяжыць),*
Крыкун крычма... *(крычыць),*
Гультай гульма... *(гуляе),*
Абібок бок... *(абівае).*

В. Цяпер давайце паспрабуем расказаць гэты жартоўны вершык інакш. Я буду пачынаць, а вы працягвайце:

Лежма ляжыць... *(лежань),*
Седзьма сядзіць... *(седзень),*
Бегма бяжыць... *(бягун),*
Крычма крычыць... *(крыкун),*
Гульма гуляе... *(гультай),*
Абівае бок... *(абібок).*

Выхавальнік дашкольнай адукацыі прапануе паслухаць іншы верш В. Віткі:

Хто чытае, той чытач,
А хто слухае — слухач,
А за ўсіх найболей спраўны,
Хто дапытлівы, цікаўны.
Хто пытае — многа знае,
Сам сабе на вус матае.

В. Каго называюць чытачом? А каго слухачом? *(Адказы дзяцей.)* Мы з вамі таксама можам сачыніць вясёлыя жарты пра розных людзей. Давайце паспрабуем. Я зноў буду пачынаць, а вы — падказваць мне словы:

Хто чытае, той... *(чытач),*
А хто слухае... *(слухач),*
А глядзіць на ўсіх... *(глядач),*
Уцякае... *(уцякач).*

Хто здагадаецца, што азначае слова дзеяч? *(Чалавек, які дзейнічае, многа працуе.)*

«АБЫЯК–АБІБОК»

Мэта: выпрацоўка арыенціроўкі на гучанне граматычных форм, якія змяшчаюць часціцу абы.

Ход мерапрыемства

Выхавальнік дашкольнай адукацыі прапануе ўспомніць верш «Лежань, седзень» В. Віткі.

Выхавальнік. Што значыць: абібок бок абівае? *(Чалавек нічога не робіць, толькі ляжыць або сядзіць, абівае бакі.)* Хто такі абібок, як пра яго сказаць іншымі словамі? *(Гультай, лянівы, няўмека.)* Пра такога гавораць: «Гультай і ляжаць стамляецца». Чаму? *(Выказванні дзяцей.)* У паэта Васіля Віткі ёсць цікавы верш пра такога чалавека. Называецца ён «Абыяк». Як вы думаеце, хто такі Абыяк? *(Выказванні дзяцей.)* Вось як пра яго расказвае Васіль Вітка:

Абыяку — абы-як,
Або гэтак, або так.
Абыяку — абы.
Абы збыць абы-куды
Абы-што, абы-чыё,
Абы толькі не сваё.
Абыяк — абібок.
Вось і весь яго
Урок.

Хто ж такі Абыяк? *(Выказванні дзяцей.)* Як усё робіць Абыяк? *(Абы-як.)* Так, ён робіць абы-як, або гэтак, або... *(Так.)* Што ён робіць? *(Абы-што.)* Куды ідзе? *(Абы-куды.)* Чаму ў вершы сказана: Абыяк — абібок? *(Выказванні дзяцей.)* Давайце з вамі завучым на памяць:

Абыяк — абібок.
Вось і весь яго
Урок.

«ШМАТ ПРАФЕСІЙ ЁСЦЬ НА СВЕЦЕ»

Мэта: выпрацоўка арыенціроўкі на гучанне граматычных форм, пры дапамозе якіх утвараюцца назвы прафесій.

Матэрыял: малюнак з выявай сталявара каля мартэнаўскай печы (можна выкарыстаць малюнкі з выявамі прадстаўнікоў іншых прафесій, якія ўзгадваюцца).

Ход мерапрыемства

Выхавальнік (В.). Дзеці, якія прафесіі вы ведаеце? *(Адказы дзяцей.)* У паэта Леаніда Дайнекі ёсць верш, які пачынаецца такімі словамі:

Шмат прафесій ёсць на свеце,
Не запішаш і ў буквар.
А найлепшая з іх, дзеці, — ...

Я не буду заканчваць радок... Скажыце, якая прафесія, на ваш погляд, самая лепшая, кім кожны з вас хацеў бы быць? *(Выказванні дзяцей.)*

Цяпер давайце паслухаем, пра якую прафесію казаў Леанід Дайнека:

Шмат прафесій ёсць на свеце,
Не запішаш і ў буквар.
А найлепшая з іх, дзеці, —
Сталявар, агню ўладар.

Як вы думаеце, што робіць сталявар? *(Выказванні дзяцей.)* Сталявар варыць сталь. Сталь — гэта такі метал.

Бачу здзіўленыя твары,
Чую: «Так не можа быць!»
Вараць кашу кашавары,
Вараць сокі сакавары,
Як жа можна сталь варыць?

На завод давайце пойдзем,
Дзе рабочы люд — не госць.
Гляньце, дзеці: на заводзе
Печ мартэнаўская ёсць.
(Паказвае адпаведны малюнак.)
І ў печы той бясконца
Полымя гудзе, пяе,
Нібы сто агністых сонцаў
Зачынілі у яе.

У блакітных акулярах,
Ад агню прыкрыўшы твар,
Сталь і днём і ноччу варыць...
(Сталявар).

Для чаго патрэбна сталь? З яе робяць розныя рэчы з металу. Што гэта можа быць? *(Выказванні дзяцей.)* Так, гэта рыдлёўкі, малаткі, станкі, рэйкі для цягнікоў, нават ракеты і многае іншае.

Значыць, хто што варыць?

Выхавальнік дашкольнай адукацыі прапануе дзецям закончыць радкі:

Вараць кашу... *(кашавары).*
Вараць сокі... *(сакавары).*
Варыць сталь... *(сталявар).*
Варыць цукар... *(цукравар).*
Сыры варыць... *(сыравар).*

В. А што робяць прадстаўнікі іншых прафесій? Я вам буду называць прафесію, а вы паспрабуйце здагадацца, што кожны з іх робіць? Што робіць пчаляр (сталяр, шкляр, маляр, камінар)? *(Дзеці спрабуюць здагадацца, разважаюць.)*

Паэт Васіль Вітка напісаў шмат цікавых вершаў пра розных людзей. Ёсць у яго верш і пра прафесіі. Я буду чытаць вам пачатак кожнага радка, а вы дагаворваць назву прафесіі:

Даглядае пчол... *(пчаляр),*
Стол майструе... *(сталяр),*
Шыбы ў вокны ставіць... *(шкляр),*
Сцены беліць... *(маляр),*
Чысціць комін... *(камінар),*
Сыры варыць... *(сыравар),*
Ну, а цукар... — *(цукравар).*

Як вы думаеце, пра каго гавораць «Хто любіць працаваць, той не будзе доўга спаць». *(Выказванні дзяцей.)*

ЛІТАРАТУРА:

1. Вітка, В. Урокі роднага слова: вершы, казкі, апавяданні / В. Вітка ; уклад. Т. С. Тарасава. — Мінск : Маст. літ., 2008.

2. Родничок: песенки, потешки, сказки, стихи, рассказы: для детей дошкольного и младшего школьного возраста / сост. Р. М. Миронова. — Минск : Юнацтва, 1989.

3. Учебная программа дошкольного образования. — Минск : Нац. ин-т образования, 2012.